Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 МАЯ 2019 г. ПЯТНІЦА № 85 (28952)

Фота БелТА. МІНСК

Фота БелТА. БРЭСТ

vitvesti.by ВІЦЕБСК

БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

74-ю ГАДАВІНУ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ АДЗНАЧАЛА ЎСЯ КРАІНА


Фота БелТА.

Нягледзячы на пахмурную раніцу, на сталічнай плошчы Перамогі сабралася шмат людзей. Гэта знакавае месца ўжо каторы год — эпіцэнтр мерапрыемстваў аднаго з найважнейшых свят краіны. Не пужае ўдзельнікаў ні магчымы дождж, ні пранізлівы вецер — узнёслы настрой паляпшае ўсе ўмовы надвор'я. Хтосьці з галоўных герояў свята — ветэранаў, нават успамінае, што тады, у 1945-м, у беларускай сталіцы таксама было дажджліва...

Павіншаваць пераможцаў і ўскласці кветкі да манумента прыйшлі прадстаўнікі ўлады і замежныя госці. Першым упрыгожыў помнік вянок Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які прыбыў на плошчу разам са сваімі сынамі. Кветкі таксама ўсклалі кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, Нацыянальнага сходу, судоў, Савета бяспекі і Узброеных Сіл, праваахоўных органаў, маладзёжных і грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі замежнага дыпламатычнага корпуса, Беларускай праваслаўнай і Рымска-каталіцкай цэркваў. Па традыцыі кіраўнік дзяржавы звярнуўся да прысутных са словамі віншавання.

«Восьмае дзесяцігоддзе беларускі народ жыве і працуе пад мірным небам. Магчымасць дыхаць свабодай, гадаваць дзяцей і радавацца кожнаму новаму дню даў нам ратны подзвіг нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Сёння мы праслаўляем мужнасць воінаў, гераізм партызанаў і падпольшчыкаў, тытанічныя намаганні працаўнікоў тылу. Менавіта на беларускай зямлі савецкія салдаты развянчалі міф аб непераможнасці ваеннай машыны Трэцяга рэйха», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт успомніў тых, хто змагаўся насмерць пад Мінскам і Магілёвам, на берагах Дняпра і Бярэзіны, адзначыўшы, што «кожны рубеж абароны для ворага быў Брэсцкай крэпасцю».

Бяда прыйшла ў тыя часы ў кожную беларускую сям'ю: дзве трэція загінулых — мірныя жыхары. Хатынь, Дальва, Азарычы, Шунеўка, Трасцянец — гэтыя месцы генацыду беларускага народа вядомы ўсяму свету. «Асаблівая тэма — лёсы дзяцей вайны. Сёння гэтыя людзі сталых гадоў — жывыя сведчанні і сведкі зверстваў акупантаў. У іх на вачах забівалі родных і блізкіх. Яны раслі ў голадзе і холадзе першых пасляваенных гадоў. На роўных з дарослымі адстойвалі і адбудоўвалі краіну. Найбольш змрочныя старонкі ў самотнай кнізе вайны — дзіцячыя донарскія канцлагеры. Праз іх прайшлі тысячы дзяцей, а выжылі адзінкі. Усім, хто сёння падтрымлівае мітынгі неанацыстаў і шэсці саста-рэлых ваяк з батальёнаў СС, трэба прыехаць у Беларусь і пабываць у пасёлку Чырвоны Бераг, дзе быў такі канцлагер. Убачыць пранізлівы крык і ўбачыць мемарыял дзіцячым марам, якія не збыліся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вялікая Перамога — трыумф жыцця над смерцю, і будучыя пакаленні павінны ведаць, якую цану народ заплаціў за свабоду, каб такое ніколі не паўтаралася.

СТАР. 2

Фота БелТА. ГОМЕЛЬ

Фота БелТА. ГРОДНА

Фота БелТА. МАГІЛЁЎ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 19085

БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Звярнуў увагу лідар краіны на тое, што мы сумуем і па ахвярах вайны — жанчынах, старых, дзецях, якія выпілі спаўна горкую чашу акупацыі.

«Вечная памяць тым, хто вельмі хацеў жыць, але склаў галаву ў баях за Айчыну, памёр ад ран, загінуў у канцлагерах і гета! Схілім галовы перад тымі, хто не прыйшоў з той вайны, ушануем іх памяць хвілінай маўчання», — пасля гэтых слоў Прэзідэнта прагучалі 20 удараў метранома.

Няўмольны час забірае ветэранаў, таму, па словах Аляксандра Лукашэнкі, наш святы абавязак — падтрымаць, ахінуць клопатам франтавікоў і працаўнікоў тылу, забяспечыць ім годнае жыццё.

«А вам, паважаныя ветэраны, як звычайна, ад мяне наказ — жыць! Сёння вы можаце ганарыцца сваімі дзецьмі і ўнукамі. Цяперашняе пакаленне ваенных свята захоўвае пераможныя традыцыі», — звярнуўся беларускі лідар да ўдзельнікаў той вайны.

На думку Прэзідэнта, галоўны ўрок Вялікай Перамогі ў тым, што за мір трэба змагацца. Не страціла гэта тэма актуальнасць і ў наш час. З глабальным тэрарызмам і іншымі пагрозамі трэба змагацца разам, адзіным фронтам. «Як гэта было тады, у далёкія суровыя саракавыя, калі ў шэрагах беларускага супраціўлення змагаліся тысячы антыфашыстаў з еўрапейскіх дзяржаў: Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Аўстрыі, Францыі, Італіі і нават Германіі, — нагадаў кіраўнік краіны і дадаў: — На жаль, у Еўропе сёння такога адзінства няма. Ідзе ўзмацненне ваеннай прысутнасці і на нашых рубяжах. Перакрэслены Дагавор аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці. Але мы ўпэўненыя ў неабходнасці канструктыўнага дыялогу з усімі краінамі».

Падзеі вялікай вайны ляглі ў аснову шматлікіх кніг і фільмаў, але ўсё роўна застаецца яшчэ досыць белых плям. У першую чаргу яны датычацца лёсаў ваенных, партызанаў, якія зніклі без звестак, загінулых падпольшчыкаў, вязняў.

«Захаваць свяшчэнную памяць пра кожнага ўдзельніка вайны для нашчадкаў — галоўная мэта рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае!». Гэты праект накіраваны ў будучыню. Гэта сапраўды «Бессмяротны полк», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба, каб дзеці, унукі і праўнукі праз лёсы воінаў-пераможцаў — сваіх родных і блізкіх, якія адстаялі мір і свабоду, — усвядомілі сябе часткай вялікай гісторыі роднай краіны, адчулі боль незаменнай страты і ацанілі веліч подзвігу савецкага салдата».

Расказаў Прэзідэнт у сваёй прамове яшчэ аб адным маштабным праекце «У гонар агульнай Перамогі!». На тэрыторыі 118 беларускіх раёнаў і прыгранічных рэгіёнаў Расіі і Украіны з месцаў воінскіх пахаванняў і гібелі жыхароў будзе ўзятая зямля. А ў юбілейны 2020 год, 9 мая, гэтыя капсулы з імёнамі загінулых размесцяць у нішах храма-помніка ў гонар Усіх Святых у Мінску.

«Толькі так, агульнымі намаганнямі, магчыма захаваць і ўвекавечыць для нашчадкаў імя кожнага воіна і зберагчы гераічную спадчыну, якая стала часткай генетычнага кода нашага народа», — сказаў Прэзідэнт і яшчэ раз павіншаваў усіх са святам Перамогі.

Зробім усё, каб не забыць

Пасля кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні журналістаў. У беларускага лідара спыталі, як захаваць памяць пра вайну, бо з кожным годам гэта становіцца рабіць усё складаней і складаней.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, натуральна, што з кожным годам гэтая задача становіцца ўсё цяжэйшай, бо час няўмольны. «Чалавечая памяць уладкавана такім чынам, што яна не можа памятаць усё, захоўваць усе. Можа, гэта з пункту гледжання фізічнага, фізіялагічнага і добра, але нам трэба думаць пра тое, як захаваць галоўнае. Галоўнае, што робіць нас людзьмі, што арыентавана ў будучыню, і гэта, натуральна, адзін з нашых сімвалаў — Дзень Перамогі. Мы ў яго занадта шмат уклалі — як мінімум, кожнага трэцяга, сцёртую з твару зямлі рэспубліку, спустошаную зямлю, але не спустошаныя душы і сэрцы людзей», — канстатаваў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы шчыра прызнаў, што праблема захавання памяці ёсць. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што большасць прадстаўнікоў беларускай моладзі — гэта адданыя і надзейныя людзі. Праходзячы міма моладзі на сталічнай плошчы Перамогі, Прэзідэнт задаўся пытаннем, а ці змогуць гэтыя людзі захаваць памяць пра вайну. «Вы ведаеце, у пераважнай сваёй большасці — абсалютна перакананы — здольныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Спрыяе захаванню памяці аб тых страшных падзеях і вялікая колькасць акцый, у тым ліку і «Беларусь памятае!», упэўнены беларускі лідар.

«Вядома, акцыямі ўсё не захаваеш. Трэба кожны дзень дзе-небудзь што-небудзь рабіць і паказваць гэта дзецям. А лепш за ўсё — і гэта галоўнае — каб дзеці самі рабілі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што некалькі гадоў таму даў даручэнне, каб школьнікі заняліся добраўпарадкаваннем помнікаў загінулым. Паводле слоў беларускага лідара, дзеці прыйшлі да кожнага помніка, сваімі рукамі аднавілі іх. І сёння кіраўнік дзяржавы бачыць гэтыя помнікі ў ідэальным стане па ўсёй краіне. «Гэта зрабілі дзеткі. Значыць, будуць памятаць», — дадаў ён.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў грамадстве ёсць тыя, хто лічыць, што гэта не наша перамога, што наша краіна выступала ледзь не агрэсарам... «Гэта ж знаходзіць водгукі ў сэрцах асобных — хай асобных, але нашых — дзетак. Гэта дрэнна. Каб захаваць памяць, нам трэба не забыцца і навучыць гэтаму сваіх дзяцей: дзе толькі магчыма, як толькі магчыма, паказваць сваім дзецям, нават самым маленькім, што гэта наша перамога і гэта не толькі здабытак тых людзей, хто перамог. Яны, вядома ж, галоўныя, яны прынеслі нам перамогу. Але гэта наша годнасць, наш здабытак, гэта сігнал, што мы нашчадкі тых, хто ўмее перамагаць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Не шукайце інтрыг ніякіх

Другое пытанне ад журналістаў датычылася святкавання Дня Перамогі ў Расіі, у прыватнасці на маскоўскай Краснай Плошчы. Сёлета дадзенае мерапрыемства не наведалі замежныя лідары — і ў асобных СМІ гэту падзею інтэрпрэтуюць па-свойму. Як да гэтага ставіцца Аляксандр Лукашэнка?

Ён звярнуў увагу, што Беларусь была прадстаўлена на Дні Перамогі ў Расіі і была прадстаўлена вельмі шырока — гэта як звычайныя людзі, так і службовыя асобы. У прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў губернатара Мінскай вобласці Анатоля Ісачанку, які нарадзіўся на Браншчыне і літаральна днямі ездзіў на радзіму, каб пакланіцца магілам сваіх продкаў. «І я яго прасіў: перадайце нашым людзям, рускім людзям, якія там жывуць, самыя добрыя пажаданні ў Дзень Перамогі. Вось гэта вось народная дыпламатыя, у якую Прэзідэнт Беларусі ўцягнуты, яна была і ёсць заўсёды», — сказаў ён.

Што датычыцца таго, што на парад у Маскве не прыехалі кіраўнікі іншых дзяржаў, Прэзідэнт заявіў наступнае:

«Не магу сказаць, што ніхто не прыехаў. Калі б расіяне ці кіраўніцтва Расіі кагосьці запрасілі, а яны адмовіліся — гэта было б «не прыехаў». Але што да нас, па-першае, мяне ніхто не запрашаў сёння ў Маскву. Па-другое, нават калі б запрасілі, тут складана было б нам неяк развесці гэтыя мерапрыемствы. Але я не магу прапусціць такое мерапрыемства [у Мінску. — **«Зв.»**] — калі б я не з'явіўся на гэтым, у вас бы была да мяне маса пытанняў».

І на гэта звярнулі б увагу не толькі журналісты, але і простыя беларусы, упэўнены кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што 9 Мая — гэта свята ўсіх і перш за ўсё — беларусаў, а таксама заклікаў часцей збірацца на нашай зямлі, у тым ліку і прадстаўнікоў былых савецкіх рэспублік.

«Канспіралогіі ніякай, палітыкі ніякай, паверце», — так адказаў на ўсе чуткі і здагадкі Аляксандр Лукашэнка.

Наш лёс — у нашых руках

Апошняе пытанне кіраўніку дзяржавы: якія пагрозы для Беларусі ёсць сёння і якія могуць з'явіцца заўтра?

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што наша краіна многія падзеі, прадказаныя намі ў іншых дзяржавах, так ці інакш ужо перажыла. Ён успомніў аўтамабілі ДАІ, якія пераварочвалі на цэнтральным праспекце Мінска, успомніў, як на плошчы Незалежнасці апаганьвалі помнік Уладзіміру Леніну. На яго думку, апошняя спроба скінуць уладу адбылася ў 2010 годзе — гэта штурм Дома ўрада.

«Да рэзідэнцыі Прэзідэнта пабаяліся падысці. Мы ўсё гэта перажылі. І гібрыды, і вось гэтыя гарачыя сутыкненні, і спробу зрынуць канстытуцыйны лад і цяперашняе кіраўніцтва — усё перажылі», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы чарговы раз падкрэсліў: для Беларусі няма ніякай небяспекі, акрамя эканомікі. «А эканоміка — гэта зноў мы. Будзем працаваць як след, будзем перш за ўсё падыходзіць да люстэрка і глядзець на сябе, будзем думаць пра тое, а што я зрабіў сам, перш чым спытаць з Прэзідэнта або ўрада ці яшчэ з кагосьці. Так, з нас трэба пытаць, але перш за ўсё з сябе. Вось калі мы будзем прынцыпова да гэтага падыходзіць і будзем заўсёды думаць пра эканоміку, пра тое, што нам трэба большменш добра жыць — а для гэтага ў нас ёсць усё, — нам ужо нічога не страшна, таму што мы перажылі ўсё», — адказаў Прэзідэнт.

На думку Прэзідэнта, нават калі заўтра кіраўніцтва краіны пойдзе на пенсію, то беларускія дзеці змогуць жыць спакойна і мірна. Аднак ён зноў акцэнтаваў увагу на першараднай важнасці эканомікі: «Трэба хутчэй разгортвацца. Сёння ў нашых руках наш лёс. І як мы ім распарадзімся — гэта залежыць толькі ад нас».

Скрозь гады і пакаленні

Сярод удзельнікаў свята былі і высокія дзяржаўныя асобы, якія падзяліліся сваімі ўражаннямі і меркаваннямі.

На думку старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла Мясніковіча, Дзень Перамогі — гэта свята свят.

«Дзень Перамогі — гэта сімвал мужнасці, сімвал гераізму нашага народа. І ад нас, ад старэйшага пакалення, залежыць, як усе гэтыя сімвалы, увагу, памяць аб тых ахвярах, якія панесла наша краіна, усе краіны, якія змагаліся з фашызмам, перададзім нашым дзецям і ўнукам», — падкрэсліў ён.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнуў увагу, што і яго пасляваеннаму пакаленню ёсць чым ганарыцца, паколькі ўздым эканомікі, дабрабыту людзей — гэта таксама няпростая праца. Ён заклікаў кожнага беларуса на сваім рабочым месцы з любоўю ставіцца да сваёй справы.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава адзначыла, што асабіста для яе з гадамі гэтае свята становіцца ўсё больш значным. «Паколькі ты ўсведамляеш усё тое, што было зроблена нашымі старэйшымі пакаленнямі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нізкі паклон усім нашым ветэранам. Для нас гэта шчасце — жыць у мірнай краіне, [мець. — **«Зв.»**] магчымасць працаваць, гадаваць дзяцей», — дадала яна.

На думку Наталлі Качанавай, для кожнага беларуса Дзень Перамогі — гэта свяшчэннае свята. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта шчыра павіншавала ўсіх з гэтым днём і пажадала дабра, здароўя, шчасця, а нашай краіне — міру і росквіту.

Для дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава Зася Дзень Перамогі — важнае не толькі дзяржаўнае, але і сямейнае свята. Пасля ўрачыстасцяў ён адзначыць яго з блізкімі. «74 гады аддзяляюць нас ад той Вялікай Перамогі. На жаль, застаецца ўсё менш ветэранаў, удзельнікаў тых баёў, але наша памяць аб гэтай вайне, перамозе, ратных подзвігах будзе жыць заўсёды ў нашым народзе. У гэтым ніхто не сумняваецца», — сказаў Станіслаў Зась. Ён падкрэсліў, што сілавы блок святкуе Дзень Перамогі разам з усёй краінай: «Канешне, хтосьці на баявым дзяжурстве ці на варце грамадскага парадку. Прафесійны абавязак — забяспечыць бяспеку нашага народа ў гэтыя святочныя дні». Станіслаў Зась пажадаў беларусам «таго, за што гінулі нашы дзяды на вайне, — мірнага неба над галавой, шчасця і дабрабыту. Яны пра гэта марылі, яны за гэта ішлі ў бой».

Галоўныя героі свята

Асаблівая ўвага не толькі ў гэтыя дні, але і заўсёды — ветэранам. Учора на плошчы Перамогі галоўныя героі свята займалі пачэснае месца побач з трыбунай. Удзельнікі вайны, вязні, блакаднікі з радасцю размаўлялі з журналістамі, дзяліліся ўспамінамі і нават чыталі свае вершы.

«Я быў прызваны ў армію ў 1944 годзе. Вучыўся лятаць. Пакуль мяне абучалі, вайна скончылася. І я так на фронт і не трапіў, але вельмі хацеў змагацца з ворагам», — усміхаецца Іван Рэдзя. Усё сваё жыццё ён прысвяціў ваенна-транспартнай авіяцыі. «Дзень Перамогі для мяне — гэта самае важнае свята. Я гэтае свята заўсёды помню», — сказаў ветэран.

Удзельнік вайны Мікалаў Іваноў нарадзіўся ў Падмаскоўі, але жыве ў Беларусі ўжо 42 гады. Сімвалічна, што і ваяваў ён на 1-м Беларускім фронце, амаль дайшоў да Берліна. «Крыху не дайшоў, бо быў паранены, тры месяцы правёў у шпіталі», — расказвае Мікалай Іваноў і ўспамінае, што навіна аб Перамозе заспела яго падчас лячэння. Франтавік заўсёды марыў звязаць сваё жыццё з кнігамі, і можна сказаць, што яго жаданне здзейснілася: ён стаў членам Саюза пісьменнікаў, піша вершы. Выдаў ужо тры кнігі, але большасць яго твораў не аб вайне — аб каханні, жыцці, Айчыне.

«У сваім раёне я пражыла ўжо 47 гадоў. Я праводжу шмат урокаў мужнасці ў Ваеннай акадэміі, школах, гімназіях. Дзеці, школьнікі, студэнты павінны ведаць пра наша мінулае і што такое вайна. Мір — гэта шчасце народа», — дзеліцца кіраўнік аб'яднання блакаднікаў Ленінграда Першамайскага раёна Мінска Тамара Вішнякова. Аб падзеях вайны яна расказвае і сваім нашчадкам. У яе шэсць праўнукаў і чацвёра ўнукаў: «Я такая багатая, бачыце. Яны павінны ведаць пра гэта, каб не было вайны».

Марыя ДАДАЛКА.
Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Агульная Перамога

Замежныя лідары і кіраўнікі міжнародных арганізацый павіншавалі Прэзідэнта і беларускі народ з Днём Перамогі.

Адным з першых свайго калегу павіншаваў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Ён звярнуў увагу, што 9 мая аддаюць даніну ўдзячнасці і глыбокай павагі ўсім тым, хто сваімі подзвігамі на франтах, у партызанскіх атрадах, у падполлі набліжаў Перамогу. «Наш святы абавязак — захоўваць памяць аб іх незлічоных ахвярах, ахінуць клопатам і ўвагай ветэранаў і, вядома, змагацца супраць любых спроб перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны з мэтай дагадзіць палітычнай кан'юнктуры», — напісана ў віншаванні.

Уладзімір Пуцін адзначыў, што ў суровыя ваенныя гады беларусы і расіяне плячо ў плячо змагаліся з фашысцкімі захопнікамі і сёння слаўныя традыцыі братэрскага сяброўства і ўзаемавыручка дапамагаюць развіваць саюзніцкія сувязі і інтэграцыйнае ўзаемадзеянне паміж дзвюма краінамі.

Паводле БелТА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

10 мая 2019 г. № 19 (504)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДАРАЖЭЙ ЗА ЖЫЦЦЁ НЯМА НІЧОГА...

Ці ёсць сэнс адмяняць мараторый на праверкі?

ФПБ плануе ўзняць пытанне мэтазгоднасці існавання мараторыя на праверкі кантрольных і наглядных органаў у існуючым выглядзе, які сёлета «адзначыць» сваё 10-годдзе. А ўся справа ў росце вытворчага траўматызму...

Што змянілася?

Сапраўды, Указ № 510, які пачаў дзейнічаць з 2009 года, на той момант дазволіў наймальнікам дыхаць лягчэй: ён гарантаваў адсутнасць неспадзяваных праверак з боку розных кантрольных органаў і, як вынік, — штрафных санкцый, якія маглі б пагоршыць фінансавы стан прадпрыемства. Дакументам прадугледжвалася, што пастукаць у дзверы з праверкай кантралёры могуць толькі праз пэўны тэрмін (звычайна, не раней чым праз 3—5 гадоў ад папярэдняга візіту) і ўсе разам, а не паасобку. Каардынаваць работу даручылі дзяржкантролю. План наведванняў фарміраваўся загадзя і вывешваўся ў агульным доступе. Здаецца, мара бізнес-супольнасці нарэшце ўвасобілася ў жыццё і палохацца больш няма чаго, калі працаваць сумленна і выконваць усё згодна з літарай закона. На той момант навацыю многія прынялі з вялікім задавальненнем, але былі і прагматыкі, якія сцвярджалі, маўляў, пачакайце — ягадкі яшчэ будуць... Няўжо, не адчуваючы бізуна ў выглядзе прыходу, скажам, супрацоўнікаў з МНС ці Дэпартамента дзяржінспекцыі працы і верагоднага штрафу за невыкананне нормаў па ахове працы або супрацьпажарнай бяспецы, кожны наймальнік будзе добрасумленна сачыць за выкананнем усіх правілаў? Сумнеўна, праўда?! Галоўнае ж на любым прадпрыемстве што? Правільна — прыбытак! Эканоміка дыктуе дырэктарам жыць з уключаным калькулятарам у галаве 24/7. А на нейкія дробязі ў выглядзе непраўдзівых драбіны ці вогнетушыцеля можна пакуль не звяртаць увагі...

стар. 2

ЁСЦЬ ПРАПАНОВА!

Паніжаць траўматызм павінна стаць выгаднай справай

За апошнія 27 гадоў каэфіцыент частаты агульнага вытворчага траўматызму ў краіне знізіўся ў 10 разоў, а паказчык частаты смяротнага траўматызму — у два з паловай разы. Аднак летась станоўчая тэндэнцыя, на жаль, парушылася. Усяго было траўмавана 2020 чалавек, што на 19,6 % больш, чым годам раней. У 2018 годзе загінулі 144 работнікі, у 2017-м — 115. Аб гэтым паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ:

— Каб знізіць вытворчы траўматызм, дапушчаны летась, неабходна прымаць дадатковыя меры. Яны ўжо распрацаваны Міністэрствам працы і сацабароны, нядаўна разгледжаны Прэзідыумам Савета Міністраў, цяпер вядзецца работа па іх рэалізацыі. Адна з нашых задач — максімальна скараціць колькасць ручной працы, паколькі самы высокі ўзровень траўматызму назіраецца менавіта ў такіх відах дзейнасці. Гэта сельская гаспадарка, будаўніцтва і транспарт. Па агульным траўматызме яны даюць больш за 42 % траўмаваных, а па смяротным — практычна палову.

Прынятыя меры ўжо даюць свой першы плён. У I квартале сёлета ў нашай краіне на вытворчасці загінулі 44 чалавекі, цяжкатраўмаваныя — 162 работнікі. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць загінулых зменшылася на 5 чалавек, а колькасць тых, хто атрымаў траўмы з цяжкім зыходам, скарацілася на 26 выпадкаў.

стар. 12

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАМПЕТЭНТНА

Ліквідацыя большасці парушэнняў у сферы аховы працы не патрабуе значных фінансавых выдаткаў

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, выказаў такое меркаванне, ацэньваючы першыя вынікі прафсаюзнага маніторынгу аховы працы пры правядзенні сёлетняй сяўбы:

— Маніторынг выканання нормаў і правілаў аховы працы пры правядзенні пасяўной кампаніі праводзіцца прафсаюзамі штогод. Сёлета гэта кампанія стартавала ў сярэдзіне лютага. На жаль, з году ў год прафсаюзны маніторынг выяўляе вялікую колькасць парушэнняў заканадаўства аб ахове працы пры арганізацыі веснавых палявых работ. Напрыклад, летась на 1472 арганізацыі, дзе праводзіўся маніторынг, прыпадала больш за 7500 розных парушэнняў. Пры гэтым большасць — прамы вынік безгаспадарчасці і неарганізаванасці адказных спецыялістаў і работнікаў на месцах.

Ліквідацыя падобных парушэнняў, як правіла, не патрабуе значных фінансавых выдаткаў і залежыць у першую чаргу ад якасці арганізацыі работ на ўсіх участках. Павінна быць адказнасць усіх — і кіраўніка, і работнікаў за тое, што адбываецца на прадпрыемстве: і за тэхніку бяспекі, і дысцыпліну, і якасць працы.

Так, досыць часта адзначаліся выпадкі допуску работнікаў да кіравання трактарамі, аўтамабілямі без праходжання перадрэйсавых аглядаў, а таксама выкарыстанне выпадковых прадметаў пры рамонце тэхнікі. Між тым гэтыя, як некаторыя лічаць, дробязі ў выніку могуць прывесці да непапраўных наступстваў. Таксама было выяўлена досыць шмат парушэнняў патрабаванняў заканадаўства пры правядзенні навучання, інструктажу і праверкі ведаў па пытаннях аховы працы. Як паказвае практыка, нярэдка менавіта з-за таго, што работніка своечасова не праінструктавалі, не нагадалі пра базавыя правілы бяспекі, і здараюцца траўмы на вытворчасці.

Улічваючы практыку папярэдніх гадоў, сёння ўсе гэтыя пытанні — пад пільнай увагай тэхнічных інспектараў прафсаюзаў. Пад кантролем таксама пытанні забеспячэння работнікаў неабходнай спецвопраткай і іншымі сродкамі індывідуальнай абароны. Гэта таксама немалаважны фактар бяспекі работнікаў.

У цэлым жа за мінулы год прафсаюзамі выяўлена больш за 64 тысячы парушэнняў заканадаўства аб ахове працы ў розных сферах. Прыпынена эксплуатацыя больш як 2200 адзінак няспраўных механізмаў і абсталявання, якія маглі стаць прычынай траўмавання работнікаў. Акрамя таго, тэхнічныя інспектары ФПБ прынялі ўдзел у расследаванні 375 няшчасных выпадкаў на вытворчасці, што дазволіла не дапусціць парушэння правоў пацярпелых і сем'яў тых, хто загінуў.

У шасці няшчасных выпадках са смяротным зыходам і ў адным, што прывёў да цяжкай вытворчай траўмы, тэхінспектары працы прафсаюзаў не пагадзіліся з высновамі дзяржаўных інспектараў працы, афармілі асобныя думкі, якія былі прыкладзены да дакументаў спецыяльных расследаванняў, і справы былі накіраваны ў суд.

Таксама тэхнічная інспекцыя працы ФПБ кантралявала выплату пацярпелым на вытворчасці работнікам і членам іх сем'яў кампенсацый, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі.

ДАРАЖЭЙ ЗА ЖЫЦЦЁ НЯМА НІЧОГА...

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

І вось ягадкі саспелі. І праявіліся ў росце колькасці пажараў і вытворчым траўматызме. Да апошняга прыгледзімся больш уважліва.

Часцей гінуць дасведчаныя...

Галоўны тэхнічны інспектар працы ФПБ Павел МАНЬКО звяртае ўвагу на лічбы:

— Па звестках Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Мінпрацы і сацыяльнай абароны, летась у арганізацыях краіны ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці загінулі 144 работнікі, 700 чалавек атрымалі цяжкія траўмы. У 2017-м лічбы былі меншыя: 115 і 593, адпаведна, — кажа ён. — Пагадзіцеся, плюс 29 загінулых — гэта зашмат...

Далі рост усе рэгіёны без выключэння. Больш падрабязна з данымі можна пазнаёміцца з нашай інфаграфікі.

Трэба адзначыць, што 24 лятальныя выпадкі на рабоце адбыліся, калі іх ахвяры былі пад чаркай і ў такім жа стане былі 35 чалавек з цяжкатраўмаваных.

Сумнае лідарства традыцыйна ўтрымліваюць такія галіны, як цяжкая прамысловасць, будаўніцтва, транспарт і сельская гаспадарка. На іх прыпадае крыху больш за 90 % ад усіх астатніх галін дзейнасці. Небяспека тоіцца падчас выканання вясенне-палявых работ і ўборачнай кампаніі, рамонту транспартных сродкаў і сезона актыўнага будаўніцтва. У кожнай з гэтых галін ёсць свае праблемы: гэта і зношанасць асноўных сродкаў, несвоечасовае забеспячэнне сродкамі індывідуальнай абароны, невыкарыстанне іх самімі работнікамі, цяжкасць у правядзенні перыядычнага кантролю, несвоечасовая выплата заробкаў, нястача сродкаў і гэтак далей.

Цікава, але факт: найбольш траўманебяспечныя дні — панядзелак і пятніца. На кожны з іх прыпадае амаль па 19 % усіх выпадкаў.

Яшчэ адна асаблівасць: траўмуюцца і гінуць не маладыя і зялёныя, а вопытныя, з вялікім стажам работнікі. Згодна з аналізам, праведзеным ФПБ, амаль палова цяжка траўмаваных была ва ўзросце 46—60 гадоў, без малога 30 % — мелі стаж ад 21 да 30 гадоў. Чаму ўсё ж такі няшчасны выпадак здарыўся? Суразмоўнік лічыць, што пачуццё страху ў такога работніка ўжо прытупляецца і інстынкт самазахавання не спрацоўвае, бо даўні тэхналагічны працэс ён выконваў кожны дзень і можа гэта зрабіць нават «з заплюшчанымі вачамі». Вынік такой упэўненасці доўга чакаць не даводзіцца.

> Вялікую ўвагу аддаём колькасці прадукцыі, а забываем аб работніку, яго ўмовах працы. Сказваюцца стомленасць, эмацыянальная напружанасць, манатоннасць і ў той жа час складанасць працы.

— Зразумела, побач з кожным наглядчыкам не паставіш і не звядзеш сумную статыстыку да нуля: на вытворчасці як гінулі, так і будуць гінуць, але наша задача — максімальна садзейнічаць таму, каб колькасць няшчасных выпадкаў памяншалася год ад году, — кажа тэхінспектар.

Інстытут грамадскіх інспектараў працы

Адной з прычын росту вытворчага траўматызму Павел Манько называе гонку прадукцыйнасці.

— Пры гэтым вялікую ўвагу аддаём колькасці прадукцыі, а забываем аб работніку, яго ўмовах працы. Сказваюцца стомленасць, эмацыянальная напружанасць, манатоннасць і ў той жа час складанасць працы, — упэўнены ён.

Што рабіць? Быць больш пільнымі: і работнікам, і наймальнікам, і тым, хто можа яшчэ ўплываць на сітуацыю з аховай працы. Так, з вядзеннем мараторыя на планавыя праверкі 10 гадоў таму, кантрольным і наглядным органам вобразна паказалі на дзверы. Толькі прафсаюзы яшчэ могуць бесперашкодна трапляць на прадпрыемства з мэтай правядзення маніторынгаў, у тым ліку за станам аховы працы. Але трэба ўлічваць той факт, што прафілактыка і вобразны бізун — рэчы розныя. Задача прафсаюзнага грамадскага кантролю — дапамагаць у пошуку недахопаў і падказваць наймальніку, як выправіць хібы, каб на вытворчасці не дайшло да трагедыі.

Менавіта таму з 1 мая ў краіне пачаў дзейнічаць інстытут грамадскіх інспектараў працы. Гаворка аб тым, што ва ўсіх раённых і гарадскіх аб'яднаннях прафсаюзаў на грамадскіх пачатках пачалі працаваць дасведчаныя ў пытаннях аховы працы людзі. З пачатку лета яны пачнуць актыўна працаваць на месцах.

Але ёсць адно важкае АЛЕ, і завецца яно падменай паняццяў. На грамадскі кантроль нельга перакладваць цяжар адказнасці за стан па ахове працы. І вось тут варта зноў прыгадаць вобразны бізун, аб якім ужо неаднаразова казалі. Суразмоўнік упэўнены: з адменай планавых праверак наймальнікі расслабіліся, бо колькі ні падказвай, але калі пакаралі рублём — даходзіць лепей.

— Задача прафсаюзаў — праводзіць прафілактыку вытворчага траўматызму, а вось кантраляваць павінны тыя, хто мае карныя паўнамоцтвы, — упэўнены ён.

Ініцыятыва ФПБ выглядае даволі лагічнай: даць магчымасць праводзіць пазапланавыя праверкі не ўсім кантрольна-надзорным органам, а толькі Дэпартаменту дзяржінспекцыі працы і МНС (бо ратавальнікі адказваюць за электрабяспеку), прыпыніўшы ў гэтым пункце дзеянне мараторыя.

❍ Толькі лічбы

У 2018 годзе адбылося 40 групавых няшчасных выпадкаў, у выніку якіх пацярпелі 105 чалавек, з якіх 15 чалавек загінулі і 28 атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы. У параўнанні з 2017-м колькасць смяротна траўмаваных выросла амаль у 1,7 раза, а пацярпелых, што атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы, паменшылася амаль у 1,5 раза.

У 2017 годзе абдылося 36 групавых няшчасных выпадкаў, у выніку якіх пацярпелі 108 работнікаў, у тым ліку 9 чалавек загінулі і 36 атрымалі цяжкія траўмы.

Замест пасляслоўя

Так, рост вытворчага траўматызму амаль на 20 % — гэта жахліва, і ў барацьбе за жыццё і здароўе людзей будуць прыдатныя ўсе сродкі. Але гаворка будзе няпоўнай, калі не закрануць яшчэ адну лічбу статыстыкі, што датычыцца смерцяў на рабочых месцах. Вышэй мы казалі аб звязаных з вытворчасцю і аформленых актамі формы Н-1. Між іншым, ёсць і тыя, што пайшлі на работу і... не вярнуліся. Кажучы сухой мовай, памерлі ад натуральных прычын.

Па словах Паўла Манько, летась 598 чалавек памерлі на рабоце, 400 з якіх — з-за стану свайго здароўя. Чаму лічба такая вялікая? Спецыялісты лічаць, што многія работнікі стараюцца не раскрываць наймальнікам сваіх дыягназаў, каб не страціць работу. Іншая справа, што ў 93 % памерлых на рабоце былі ў наяўнасці медыцынскія прафагляды. Але гэта ўжо пытанне да якасці іх правядзення і зусім іншая, як кажуць, гісторыя...

Вольга АНУФРЫЕВА.

Колькасць загінулых на вытворчасці



Колькасць цяжкатраўмаваных на вытворчасці



Па аператыўнай інфармацыі тэхінспекцыі ФПБ.

Інфаграфіка Ірыны ТАМКОВІЧ.

Запрашальнік

КІШЭНІ, ПОЎНЫЯ САТЫРЫ

Фота Аляксея МОЛЧАНА.

Тэатр Генадзя Гладкова «Тэрыторыя мюзікла» парадуе мінчан і гасцей сталіцы чарговай навінкай — стэндап-мюзіклам «Кішэнны тэатр» паводле п'есы яркага і правакацыйнага, па-свойму дасціпнага французскага драматурга Жана Както. Прэм'ера прызначана на 20 чэрвеня на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў.

Както пісаў маналогі «Кішэннага тэатра» для сваіх сяброў Эдзіт Піяф, Ганны Маньяні, Жана Марэ і часта натхняўся прыкладамі з рэальнага жыцця. Маналог «Раўнадушны прыгажун» для Эдзіт Піяф, напрыклад, быў падгледжаны падчас сваркі актрысы з яе мужам... У Палацы культуры прафсаюзаў Піяф, канешне, не будзе — затое будуць акцёры Дзмітрый Якубовіч, Эдуард Вайніловіч, Арцём Пінчук, Ксенія Харашкевіч і Паліна Дабравольская, якія сыграюць галоўныя ролі ў тэатральным эксперыменце.

Дарэчы, амаль 20 гадоў таму «Кішэнны тэатр» ужо выходзіў на рускамоўную сцэну — у пастаноўцы рэжысёра Пятра Штэйна ў «Ленкоме». Але тэатр «Тэрыторыя мюзікла» не паўтарае ранейшы спектакль — пастаноўшчыкі зрабілі новы пераклад з англійскай і перачыталі арыгінал п'есы на французскай мове, выбраўшы з тэксту аўтарскія жарты і сатырычныя прыёмы. Акрамя таго, спалучаючы музычныя нумары і фармат стэндап-выступленняў (комік, мікрафон, гледачы), рэжысёр і акцёры паспрабуюць знесці «чацвёртую сцяну» паміж артыстамі і залай, прыцягнуць публіку да дыялогу.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 88

20—21 красавіка 2019 года ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках прайшоў турнір памяці вядомага беларускага майстра Марата Сямёнавіча Гелера. Сярод 32 удзельнікаў было тры міжнародныя гросмайстры. Пасля ўпартай барацьбы ў сямі турах да фінішу з аднолькавым вынікам 10 ачкоў з 14 магчымых прыйшло адразу шэсць удзельнікаў. Найлепшы каэфіцыент аказаўся ў міжнароднага майстра Аляксея Куніцы, ён і стаў пераможцам турніру.

З 27 красавіка ў пасёлку Кранева (Балгарыя) праходзіў маладзёжны чэмпіянат Еўропы па шашках-64. У першы дзень спаборніцтваў па бліцы чэмпіёнамі сталі Уладзіслаў Валюк, Яна Якубовіч, Марат Леў, Вікторыя Нікалаева і Дар'я Нікіфарава!

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя нашымі чытачамі.

№ 37 Юрый Мурадаў (Барысаў)

Белыя простыя шашкі: c1, e1, g1, g3, h4 (5).

Чорныя простыя шашкі: a5, b4, c3, d2, d4, e3 (6).

№ 37

№ 38 Іван Івацка (Украіна)

Белыя простыя шашкі: 41, 38, 33, 30, 24, 25, 20 (7).

Чорныя простыя шашкі: 36, 27, 29, 18, 12, 13, 9 (7).

№ 39 Іван Наўроцкі (Мінск)

Белыя простыя шашкі: 10, 23, 30, 31, 37, 48, 49 (7).

Чорныя простыя шашкі: 12, 22, 25, 27, 33, 36, 39, 42 (8).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс: 12 мая ў Мінску (бібліятэка № 20, вул. Жукоўскага, 9/1) у 12.00 адбудзецца турнір па шашках-64 сярод ветэранаў. Арганізатар — Алена Сцяпанаўна Меленец, тэл. 80299169360.

З 24 мая да 2 чэрвеня 2019 года ў РЦАП па шахматах і шашках (вул. К. Маркса, 10) адбудзецца чэмпіянат Беларусі сярод мужчын і жанчын па шашках-64. У мужчынскім турніры чакаецца ўдзел пяці міжнародных гросмайстраў, у жанчын выступяць два гросмайстры.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 87 ад 26.04.2019.

№ 35 1.bc7 d:b6 2.c:a7 a:c5 3.d:b6 gh4 4.ab8 ed6 5.b:g7 h:f6 6.bc7 hg3 7.ef4 g:e5 8.cd8 ed4 [8...fg5 9.d:h4 ed4 (9...ef4 10.hf2 x) 10.hg5 dc3 11.gc1 x] 9.d:g5 dc3 10.gc1+

№ 36 1.cd8 ae5 2.de1 db6 3.ed4 ec3 4.ed8+

Дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

«Мы вам самі ўсё пакажам!»

40 гадоў таму быў зняты смешны і сумны «Гараж»

Сатырычная трагікамедыя Эльдара Разанава нарадзілася наўпрост з жыцця — пасля таго, як рэжысёр сам пабываў на сходзе гаражнага кааператыва супрацоўнікаў студыі «Масфільм». Замест паўгадзіны рэжысёр правёў на сходзе практычна суткі і вярнуўся дадому ў шоку ад убачанага і пачутага. І хоць, безумоўна, НДІ па абароне жывёл ад навакольнага асяроддзя — зусім не тое самае, што творчае кола кінематаграфістаў, але ператварэнне быццам бы інтэлігентных, выхаваных, даўно знаёмых паміж сабой людзей у баязлівую і бессаромную «зграю таварышаў», гатовых зрабіць подласць дзеля машына-месца, — відовішча не для слабых нерваў. А ў Разанава яно атрымалася да таго ж настолькі вострым і пазнавальным, што фільм мог наогул не выйсці на экраны.

Так, яшчэ на стадыі ўзгаднення сцэнарыя пільныя цэнзары павыкрэслівалі мноства рэмарак Эміля Брагінскага і Эльдара Разанава — у прыватнасці, загадалі прыбраць пасаж пра намесніка старшыні кааператыва — «шэрага кардынала, які насамрэч галоўнейшы за кіраўніка» (бо менавіта «шэрым кардыналам» у той час у партыйных колах называлі Міхаіла Суслава). У гатовым фільме высокае кіраўніцтва разлаваў дыялог пра вучоных, якіх адправілі перабіраць бульбу ў калгас, і візітоўку, якую пакінуў у кожным мяху іхні кіраўнік... Выратаваў карціну толькі збег абставін: якраз напярэдадні здачы на пленуме ЦК КПСС Брэжнеў патрабаваў бязлітасна крытыкаваць хібы грамадства. І атрымалася, што «Гараж» гэтым заклікам якраз адпавядае. Але ўсё адно рэжысёру адпомсцілі — прэм'еру не пусцілі ў цэнтральныя кінатэатры, каб афішы не мазолілі вочы ўздоўж урадавай трасы. Тым не менш «Гараж» толькі ў першы год паглядзела больш за 28,5 мільёна чалавек, а цытаты з фільма пайшлі ў народ — пэўная прыкмета поспеху.

У якасці дэкарацый быў выбраны заалагічны музей, што дазволіла разнастаіць дзею, якая цягам 1,5 гадзіны адбываецца ў замкнутай прасторы з удзелам адных і тых жа персанажаў.

Здымкі доўжыліся менш як месяц (толькі на гэты тэрмін рэжысёр, уключыўшы ўсе сувязі і асабістае абаянне, адпрасіў з тэатраў на здымкі найлепшых акцёраў). А каб яшчэ паскорыць працэс, кожную сцэну фіксавалі адначасова тры камеры з розных ракурсаў, а падчас мантажу пакідалі самыя ўдалыя фрагменты.

Не ўдалося ўключыць у акцёрскі ансамбль толькі Аляксандра Шырвінта. І зноў жа спрацаваў збег абставін: у суседнім павільёне ў гэты час здымаўся Валянцін Гафт, яму прапанавалі ролю — і ён не толькі бліскуча сыграў, але і сустрэў на здымачнай пляцоўцы свой лёс, будучую жонку Вольгу Астраумаву.

Як і ў іншых сваіх фільмах, Разанаў сыграў тут у эпізодзе — начальніка аддзела насякомых, які праспаў увесь сход, а таму выцягнуў нешчаслівае жэрабя выключэння з кааператыва.

«Мне б вельмі хацелася, каб «Гараж» састарэў як мага хутчэй, — прызнаваўся рэжысёр, — але, на жаль, ён дагэтуль застаецца люстэркам нашага непрывабнага жыцця...» Паглядзецца наноў у гэта люстэрка можна на канале «МІР» 17 і 18 мая — і, дай бог, не пабачыць сябе...

Сказана!

«У час здрадзіць — гэта не здрадзіць, гэта прадбачыць».

«Залаты мой, што, што, а права вы маеце».

«Таварышы, у мяне ўжо курыца пацякла!»

«Законным шляхам ісці можна — дайсці цяжка».

«Ён ляжыць у знак пратэсту!»

«Як ветэрынар, я абяцаю вам, пражэрлівы мой, заварот кішак».

«Чалавек — гэта таксама жывёла, яго таксама трэба ахоўваць. — Ад каго? — Чалавека трэба ахоўваць ад чалавека».

«Не чапайце макаку сматранскага! Гэта ж адзіны экзэмпляр у нас у краіне!»

«Спаць на стале прэзідыума маюць права толькі члены кааператыва».

«Серабрысты журавель — птушка цёмная, яна газет не чытае і таму не мае ўяўлення, наша яна ці капіталістычная».

Ад мудрагелістых слоў непамысна робіцца

Свой, адметны чытач у газеты «Звязда». Ён жа, хочацца верыць, глядач тэлеканала «Беларусь 3» і ў прыватнасці праграмы «Размаўляем па-беларуску». Гэтая тэлевікторына ўжо каторы год у эфіры і магла б выходзіць далей — у звычным фармаце. Аднак стваральнікі вырашылі ўдасканаліць яго (над чым і працуюць)...

А пакуль усе, хто цікавіцца мовай, шануюць яе і, магчыма, плануюць удзел у віктарыне, могуць праверыць сваё веданне з дапамогай «Звязды». Такім чынам ці ведалі вы, што:

аха́йны — старанна прыбраны; чысты, акуратны;

вы́жал — гончы сабака;

мудраге́лісты — 1) цяжкі для разумення, выканання; складаны; 2) замысловаты, вычварны;

непамы́сна — 1) прыкра, непрыемна; 2) (у значэнні выказніка) аб пачуцці прыкрасці, незадавальнення;

пе́сціць — 1) любоўна даглядаць, гадаваць каго-небудзь; ствараць для жыцця, дзейнасці каго-небудзь вельмі спрыяльныя ўмовы; патураць усім жаданням; з любоўю даглядаць, ахоўваць што-небудзь; 2) праяўляць ласку, лашчыць, галубіць каго-небудзь; 3) дзейнічаючы на органы пачуццяў, выклікаць прыемныя адчуванні (пра вецер, сонца і падобнае); 4) жадаць здзяйснення чаго-небудзь прыемнага;

праплі́шчыцца — прабрацца, пралезці праз што-небудзь, кудынебудзь з намаганнямі;

раху́ба — 1) падлікі, разлікі; 2) карысць, выгада, сэнс;

скна́рлівы — надзвычай скупы, прагны;

то́ня — 1) участак вадаёма, прызначаны для лоўлі рыбы закідным невадам; 2) адзін закід нявада, а таксама ўлоў ад аднаго закіду;

тук — 1) мінеральнае ўгнаенне; 2) растоплены тлушч.

панядзелак, 13 мая

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.15 «Зона Х» (16+).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Бацькоўскі бераг». 1-я і 2-я серыя (16+).
12.50, 13.05, 14.45, 15.25 Меладрама «Лжэсведка». 1—4-я серыі (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «Жанчыны і спорт». Дак. фільм.
22.25 Серыял «След» (16+).
23.55 «Арэна».
0.55 «Дзень спорту».

Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.40 «Тэлебарометр».
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
9.45 «Капейка ў капейку» (12+).
10.20 «Свет навыварат. Японія» (16+).
11.15 Анімацыйны фільм «Кунг-фу панда» (12+).
12.40 Анімацыйны фільм «Кунг-фу панда-2» (12+).
14.00 Трылер «Паветраны маршал» (12+).
15.45 Маст. фільм «Паляўнічыя на прывідаў» (12+).
17.40 «Пагоня за смакам» (16+).
19.15 «Суперлато».
20.40, 22.05 «Тата папаў» (16+).
22.00 КЕНО.
23.15 «Ідзі сюды і танцуй».
23.20 Серыял «Жаночы доктар» (16+).
0.10 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.40, 12.20 «Беларуская кухня». Халаднік, аладкі.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 12.15, 20.30 «Гэты дзень».
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.25, 17.05 «Прафесія — следчы». Серыял. 1-я серыя (12+).
10.35 «Навукаманія» (6+).
— Куды больш важным выглядае трымаць на кантролі прычыны і ўмовы ўзнікнення траўмы альбо няшчаснага выпадку. Бо многія і многія няшчасці, трагедыі можна было б папярэдзіць, каб людзі, адказныя на прадпрыемстве за ахову працы, сумленна выконвалі свае абавязкі, а кіраўнікі аддавалі гэтым пытанням належную ўвагу. Сёння спецыялістам па ахове працы мусіць станавіцца кваліфікаваны інжынер, які павінен быць кампетэнтны ў справе абсталявання, можа ўнікаць у тэхналогію вытворчасці і выдаваць прапановы па паляпшэнні вытворчага працэсу на карысць бяспекі. Ды і не толькі прапаноўваць — яго задача, але і дабівацца правядзення ў жыццё прапаноў. Значыць, чалавек на гэтай пасадзе павінен быць ініцыятыўны, адукаваны і прабіўны ў пэўным сэнсе. Не сакрэт, што трапляюцца ўсё ж выпадковыя людзі, якія сваім абавязкам лічаць манатонна правесці інструктаж, даць людзям распісацца ў журнале і пакласці апошні на паліцу. Так што пытанні бяспекі павінны вырашацца перш за ўсё на тэхнічным узроўні. І на многіх прадпрыемствах менавіта так робяць.

У размове з Віктарам Супруновічам мы не маглі абысці холдынгавую кампанію «Пінскдрэў». Яшчэ не прайшло дзесяць гадоў пасля страшнай трагедыі, калі ад выбуху на адным з прадпрыемстваў кампаніі загінулі 14 чалавек, трое сталі інвалідамі. Здарэнне назвалі самай буйной прамысловай аварыяй у краіне за некалькі дзесяцігоддзяў. А летась зноў загінулі два чалавекі. Адзін з іх загінуў у ванне для прамочвання піламатэрыялаў.

На «Пінскдрэве» летась прайшло выязное пасяджэнне калегіі Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы. Члены калегіі і спецыялісты наведалі шэраг вытворчасцяў холдынга, пазнаёміліся з арганізацыяй аховы працы. Былі ўнесены канкрэтныя прапановы. Трэба сказаць, што прадпрыемства прыняло пэўныя меры па паляпшэнні абстаноўкі. На тым участку, дзе летась рабочы ўпаў у басейн з вадой, змяняецца тэхналогія вытворчасці. Закуплена

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

новае абсталяванне, якое выключае знаходжанне чалавека каля рэзервуара з вадкасцю. Неабходныя маніпуляцыі цяпер будзе праводзіць аўтаматыка. Абсталяванне абышлося холдынгу ў пяцьсот тысяч долараў. І так павінна быць паўсюль. Бо бяспека перш за ўсё.

ЦАНА НЕАБАЧЛІВАСЦІ

Але ж галоўнай прычынай траўмавання і гібелі людзей на вытворчасці па-ранейшаму з'яўляецца парушэнне правілаў тэхнікі бяспекі самімі пацярпелымі. Калі звярнуцца да сумнай леташняй статыстыкі, нельга пакінуць па-за ўвагай, што шэсць чалавек з тых, хто загінуў, былі ў стане алкагольнага ап'янення. Знаходзіцца на рабоце нападпітку гэта ўжо надзвычайнае здарэнне, а тут яшчэ чалавек пачынае працаваць з тэхнікай і агрэгатамі. І сёлета, на жаль, не абыходзіцца без падобных трагедый. Напрыклад, у сакавіку на работу ў адну з прыватных кампаній спазніўся кіроўца пагрузчыка. Інжынер, які павінен быў дапусціць працаўніка да работы, паехаў на іншы аб'ект, не мог жа ён сядзець і чакаць аднаго, калі яго самога чакалі іншыя. А чалавек прыйшоў пазней і прыступіў да работы. Літаральна праз паўгадзіны ён загіне, бо выпадкова націсне рычаг нахілу мачты, калі галава будзе знаходзіцца ў небяспечнай зоне. Пасля правядзення экспертызы было ўстаноўлена 2,2 праміле алкаголю ў крыві загінулага кіроўцы. Работнік быў дастаткова кваліфікаваны, меў вялікі вопыт работы.

Віктар Фёдаравіч згадаў некалькі трагедый за мінулыя гады, якія адбываліся прыкладна па адным сцэнарыі. Цвярозы трактарыст прыступае зранку да работы, цягам дня яго наведваюць спецыялісты гаспадаркі, у іх не ўзнікае прэтэнзій да якасці ворыва альбо сяўбы. А вечарам механізатар выпадае з трактара і гіне, бо да канца рабочай змены ён ужо аказваецца з тымі самымі гібельнымі праміле алкаголю. Дарэчы, амаль 60 працэнтаў з пацярпелых на вытворчасці ў рэгіёне летась былі працаўнікамі сельгасарганізацый розных формаў уласнасці.

ЗОНЫ РЫЗЫКІ

Адной з дзейсных формаў прафілактыкі з'яўляецца вучоба кіруючага звяна. Асабліва, калі гаворка ідзе пра пачаткоўцаў у вытворчасці, невялікія прадпрыемствы, індывідуальных прадпрымальнікаў. Скажам, у апошнія гады ў работнікаў Дэпартамента працы пытанні выклікала арганізацыя лесанарыхтоўкі. Апошняя актыўна вядзецца ў Івацэвіцкім раёне, там многа профільных перапрацоўшчыкаў. Зразумела, ІП імкнуцца зарабіць паблізу ад дому. Нярэдка яны прыцягваюць да работы выпадковых людзей на падставе вуснай дамоўленасці. Тут ужо гаворка не ідзе пра сертыфікаты, неабходную падрыхтоўку і адпаведны допуск да работы. Дык вось Івацэвіцкі райвыканкам сабраў усіх зацікаўленых асоб, для іх інспектары працы правялі грунтоўны семінар, дзе расказалі аб правілах допуску людзей да работы на лесанарыхтоўках. Таксама з дапамогай кваліфікаваных вальшчыкаў лесу правялі практычныя заняткі. Шэраг удзельнікаў вучобы выказалі падзяку, бо многіх рэчаў яны проста не ведалі.

Як, здараецца, не ведаюць бацькі, якія адпраўляюць дзяцей-школьнікаў папрацаваць на летніх канікулах. Вядома, прыцягваць да працы падлеткаў, адарваць іх ад камп'ютараў і тэлефонаў выглядае вельмі нават станоўчым фактам. Але ж бацькі павінны ўпэўніцца, наколькі бяспечныя ўмовы працы там, дзе знаходзіцца іх дзіця. Ну і ў першую чаргу работадаўца поўнасцю нясе адказнасць за бяспеку непаўналетняга. На жаль, летась не абышлося без траўмаў у дзяцей. На адным з прыватных прадпрыемстваў па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Івацэвіцкім раёне 14-гадоваму хлопцу даверылі кіраваць вытворчай лініяй. Падлетак атрымаў траўму, якая прывяла да цяжкай інваліднасці. Другі няшчасны выпадак быў у Пінскім раёне, там, на шчасце, абышлося лёгкай траўмай. Зараз абласное ўпраўленне Дэпартамента дзяржінспекцыі працы распрацоўвае памяткі для старшакласнікаў і іх бацькоў па бяспецы летняй работы. Спецыялісты аховы працы выступаюць у навучальных установах, як у школах перад старэйшымі вучнямі, так і перад выпускнікамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў. Будучым маладым спецыялістам не лішнім будзе нагадаць аб правілах бяспекі на рабоце, пазнаёміць з нюансамі працоўнага заканадаўства.

САМАЕ ВАЖНАЕ

Віктар Супруновіч адзначыў эфектыўнасць мабільных груп выканкамаў. Група Брэсцкага гарвыканкама двойчы на тыдзень выязджае на прадпрыемствы абласнога цэнтра. Цяпер, вядома, павышаная ўвага аддаецца аб'ектам тысячагоддзя, бо ў горадзе вядзецца інтэнсіўнае будаўніцтва. Многія арганізацыі працуюць у дзве-тры змены практычна без выхадных. Прафілактычнае мерапрыемства як напамін пра безумоўнае захаванне правілаў бяспекі тут заўсёды дарэчы.

— І ведамасны кантроль, якім з'яўляюцца мабільныя групы, і грамадскі, які найчасцей праводзяць прафсаюзы, вельмі патрэбны любой вытворчасці, — кажа начальнік упраўлення. — Бо самае цяжкае — адпраўляць на пенсію па інваліднасці альбо, наогул, хаваць маладых і здаровых. Чвэрць стагоддзя працую ў гэтай сістэме, а роспач ад многіх трагедый не прытупляецца ў свядомасці. Як сёння памятаю разгубленыя вочы бацькоў, жонак, малых дзяцей двух супрацоўнікаў рыбгаса, якія загінулі пры вылаве рыбы. Яны жылі на адной вуліцы, у абаіх па двое малых дзяцей, даволі маладыя яшчэ бацькі... Альбо нядаўні выпадак. У Пружанскім раёне на фабрыцы загінуў 35-гадовы бацька сямейства. Мне давялося гаварыць з яго жонкай. У такіх сітуацыях цяжка бывае знайсці патрэбныя словы спачування і падтрымкі, ахоплівае адчуванне ўласнай віны за тое, што нехта недзе не дагледзеў, не прыняў меры прафілактыкі. Таму самае важнае ў працы — яе бяспека.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НА СЛЫХУ

Патрэбны дзяржаўны тэхагляд

Памятаеце петыцыю, якую падпісалі больш за тысячу кіроўцаў сталічнага грамадскага транспарту адносна праблем работы «Мінсктранса»? Яны сцвярджалі, што аўтобусы і тралейбусы нярэдка выходзяць на лінію з няспраўнасцямі, звяртаючы ўвагу на тое, што не адмаўляюцца выконваць сваю работу, але хочуць, каб былі створаны здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

З пытаннем «Што змянілася?» мы звярнуліся да **старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый Уладзіміра РЫНГА.**

Як паведаміў суразмоўнік, у галіновага прафсаюза ёсць пытанні да якасці правядзення тэхнічнага агляду. Гэта сталася таму, што ў Беларусі на сённяшні дзень не існуе абавязковага дзяржаўнага тэхнічнага агляду для электратранспарту. Што з гэтага вынікае? Не надта добрае становішча — за тэхнічным станам тралейбусаў арганізацыі павінны сачыць самастойна: гэта значыць, праводзіць тэхнічны агляд і абслугоўванне электратранспарту на сваёй базе. А вось удзел ДАІ ў гэтым працэсе адсутнічае.

— Фактычна гэтае пытанне аддадзена на водкуп саміх арганізацый. З аўтобусамі іншая справа — ім не патрэбны «падвясны шлях», каб зрабіць гэтую ацэнку ў Дзяржаўтаінспекцыі ў адрозненні ад тралейбусаў, — кажа ён. — Таму ў дзеючым Законе «Аб дарожным руху» адсутнічае норма, якая абавязвае арганізацыі грамадскага электратранспарту, што аказваюць паслугі па перавозцы пасажыраў, праходзіць дзяржаўны тэхнічны агляд.

Лідар галіновага прафсаюза пагаджаецца, што хібы заканадаўства выпраўляць неабходна, таму анансуе прапановы, што зараз рыхтуюцца ў ФПБ адносна змен у існуючым заканадаўстве, і датычацца яны абавязковага праходжання дзяржаўнага тэхнічнага агляду электратранспартам.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ЛЮДЗІ ГІНУЦЬ НА РАБОЦЕ. ХТО ВІНАВАТЫ?

Пытанне, як той казаў, на засыпку. За мінулы год у Магілёўскай вобласці павялічылася колькасць няшчасных выпадкаў на рабоце, у тым ліку і смяротных. З работы не вярнулася 17 чалавек. Пяць з іх загінулі ў Магілёве, па два ў Бабруйску, Крычаўскім і Касцюковіцкім раёнах, па адным — у Чавускім і Глускім. Людзей не вярнуць, але што трэба зрабіць, каб трагедый больш не адбывалася? Разбіраемся разам з пракурорам аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Дзянісам ХМЯЛЬКОВЫМ.

Надзея на выпадковую ўдачу

— У Магілёўскай, як і ў іншых абласцях, дзейнічае зацверджаны аблвыканкамам Комплекс мер па папярэджанні гібелі і траўмавання людзей, па ўмацаванні вытворча-тэхналагічнай, выканаўчай і працоўнай дысцыпліны, бяспекі вытворчай дзейнасці. Усе яго патрабаванні павінны выконвацца, — канстатуе суразмоўнік. — Але, як паказаў аналіз, гэта не заўсёды выконваецца. Прычым не толькі работадаўцамі, але і самімі работнікамі. Напрыклад, пяць смяротных выпадкаў з 17 адбыліся непасрэдна па віне саміх жа працуючых. У той жа час у 57 выпадках з 113 ужо расследаваных спраў віна была на наймальніках. На іх жа сумленні 9 чалавечых жыццяў.

Пункт 15 Комплексу мер патрабуе, каб гар-, райвыканкамы кожны выпадак п'янства на рабоце або з'яўленне ў нецвярозым стане (ужывання наркотыкаў і іншых небяспечных для здароўя рэчываў) разглядаўся па поўнай строгасці. Аднак не ўсе гэта прымаюць да ведама. Напрыклад, Бабруйскі райвыканкам за ўвесь мінулы год звестак аб прыцягненні працуючых да адміністрацыйнай адказнасці за такія дзеянні не меў, у той час як РАУС гэтага раёна пакараў 54 чалавекі. Дарэчы, колькасць парушальнікаў, якія прыйшлі на работу «пад мухай», або спажывалі спіртныя напоі на рабоце, склала летась больш як 1000 чалавек у машынабудаўнічых, металаапрацоўчых і іншых арганізацыях, на прадпрыемствах харчовай і лёгкай прамысловасці, у будаўніцтве, на транспарце, у сельскагаспадарчых арганізацыях, гандлі і грамадскім харчаванні. Гэта на 3 % больш, чым у 2017-м. Пры гэтым у 2018-м на 4 % (да 1 тысячы 800) павялічылася колькасць выпадкаў, калі людзі з'яўляліся на работу ў стане алкагольнага ап'янення. Больш за 1 тысячу 200 чалавек былі адхілены ад работы ў сувязі з тым, што ў іх выявілі ў крыві алкаголь, а 600 — у сувязі з тым, што ў іх выявілі наркотыкі. Пры гэтым у 2017-м было выяўлена 1 тысяча 400 такіх парушальнікаў.

Імя салдата

ПА СЛЯДАХ БАТАЛЬЁНА УЛАДЗІМІРАВА

Нямецкія аэрафотаздымкі дапамаглі магілёўскім пошукавікам знайсці астанкі болей чым дваццаці байцоў Чырвонай Арміі

Вышыня каля вёскі Гаі — наогул месца загадкавае. Тут на подступах да Магілёва ў ліпені 41-га амаль цалкам загінуў батальён капітана Уладзіміра. Засталося ўсяго некалькі байцоў, якія потым расказвалі пра тыя жорсткія баі. А заадно паказвалі прыблізнае месца, дзе пахаваны загінулыя курсанты. Тут устаноўлены мемарыял, зроблена алея памяці. Але знайсці астанкі тых міліцыянераў, якія абаранялі гэтую вышыню, усё ніяк не атрымліваецца. Сёлета пошукавікі працавалі па нямецкіх аэрафотаздымках. За чатыры дні былі паднятыя 23 байцы і шмат розных ваенных і бытавых рэчаў. Але інтрыга, як той казаў, засталася. Сярод знойдзеных — ніводнага міліцыянера.

За сто метраў ад Шклоўскай шашы

У 90-я гады на вышыні капітана Канстанціна Уладзіміра вяліся раскопкі, у якіх прымаў удзел яго сын і адзін з відавочцаў. Капалі, лічы, наўздагад, таму, напэўна, нічога асабліва і не знайшлі. Летась упершыню пасля развалу Саюза былі арганізаваны маштабныя раскопкі з удзелам 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Былі вялікія спадзяванні, адпаведна, больш грунтоўная падрыхтоўка, але вынікі зноў аказаліся сціплымі. Знайшлі толькі аднаго чырвонаармейца. Да чарговага сезона рыхтаваліся больш сур'ёзна, старанна працавалі з архіўнымі дакументамі, у тым ліку нямецкімі. І ўжо за першыя некалькі гадзін пошукаў атрымалася знайсці чацвярых байцоў і шмат рознай амуніцыі.

Уявіце сабе бясконца роўнае поле, якое штогод засяваецца. Справа могілкі, злева — пералесак, з аднаго боку шаша, з другога — тая самая вышыня капітана Уладзіміра. І па дыяганалі гэтага поля раскопы, вакол якіх круцяцца хлопцы ў камуфляжнай форме. Гэта пошукавікі магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру», супрацоўнікі і курсанты Магілёўскага інстытута МУС і спецыялісты 52-га асобнага спецыялізаванага батальёна. Падыходжу да адной групы пошукавікоў. Яма глыбінёй паўтара метра, не менш. Унізе прарысоўваюцца контуры чалавека, дакладней таго, што ад яго засталося. Наверсе на посцілцы ляжыць праржавелая каска, скрыня з акуратна скручанай кулямётнай стужкай ад «Максіма», салдацкая спражка, патроны ў пачках, шклянная пляшка, іншыя рэчы.

Знойдзены яшчэ адзін абаронца.

— На гэтым месцы акрамя курсантаў змагаліся апалчэнцы і вайскоўцы, — кажа адзін з пошукавікоў. — Тут маглі быць і курсанты міжкраявой школы НКУС. Разам з чырвонаармейцамі яны ўваходзілі ў зводны полк маёра Васіля Кацюшына. Байцы засталіся ляжаць на полі бою там, дзе іх знайшла варожая куля. Крыху, магчыма, былі прыкапаныя, і ўсё.

Пошукавік Антон Пракапнёў кліча паглядзець рэчы з другога раскопу:

— Знойдзены дзве самазарадныя вінтоўкі Токарава, боезабеспячэнне да адной з іх, магазін, два дыскі з патронамі да кулямёта Дзегцярова, — пералічвае ён знаходкі. — А ў зямлі, як паказваюць прыборы, ляжыць яшчэ адзін аб'ект.

На глыбіні ад паўметра і болей

Сёлета пры дапамозе Магілёўскага аблвыканкама было закуплена 36 здымкаў Люфтвафэ, на якіх адлюстраваны пазіцыі савецкіх войскаў. Гэта грунтоўна дапаможа магілёўскім пошукавікам.

— Па аэрафотаздымках мы маглі болей дакладна высветліць, што тут адбывалася, — кажа **Павел КОНЧЫКАЎ, пошукавік клуба «Віккру».** — На полі, якое гадамі аралася, няма іншай магчымасці знайсці тыя траншэі. Па дробных дэталях мы ўстанавілі прыблізнае іх месцазнаходжанне. Тут быў супрацьтанкавы роў, які пачынаўся за вунь тымі могілкамі і даходзіў да самага Дняпра.

На калгасным полі знайшлося шмат траншэй, адзіночных акопаў, невялікіх умацаванняў. Як толькі немцы акупавалі гэтую тэрыторыю, тут ужо на наступны год пачаліся палявыя работы. Пошукавікі кажуць, што ўсё, што засталося на паверхні ад баёў, звозілася кудысьці і проста закопвалася. А пасля вайны тут ужо ніхто нікога не шукаў. Захавалася толькі тое, што ляжыць на глыбіні ад паўметра і болей. Бо ворны слой складае дзесьці каля 30 сантыметраў.

Дарэчы, нямецкія аэрафотаздымкі дазваляюць убачыць лінію абароны не толькі ў межах вёскі Гаі. На фота большая частка Магілёва, яго наваколлі, некаторыя пазіцыі на Проні і ў раёне Гомельскай шашы.

— У нас вялікія планы на гэты год, будзе шмат работы па гэтых здымках, — кажа Павел. — Месца, дзе мы зараз капаем, прапрацоўвалася на працягу двух гадоў, было шмат памылак і недакладнасцяў. Зараз мы іх выпраўляем.

Антон ПРАКАПНЁЎ дэманструе знаходкі.

Для нас гэта болей, чым проста выхаванне

Для Магілёўскага інстытута МУС вышыня капітана Уладзіміра — святое месца. Пры інстытуце існуе гістарычны клуб, які займаецца пошукам звестак пра сваіх мужных папярэднікаў. Складана тое, што ўся інфармацыя аб супрацоўніках міліцыі была засакрэчаная.

— Пасля леташніх сціплых вынікаў пошукавай экспедыцыі на гэтай вышыні нашы афіцэры, неабыякавыя да памяці абаронцаў Магілёва, добраахвотна сабралі грошы і купілі здымак Люфтвафэ, — кажа **Аляксей ЦЮЦЮНКОЎ, старшыня гістарычнага клуба Магілёўскага інстытута МУС і баец клуба «Віккру»**. — Каштаваў ён нятанна, але гэта цалкам акупілася. Потым аблвыканкам купіў яшчэ колькі здымкаў. Па іх мы ўбачылі ўсю сістэму абароны савецкіх войскаў на гэтым участку фронту і звузілі месца пошукаў да канкрэтнага поля. Подзвіг батальёна апісаны вельмі схематычна, любы даследчык, які спрабуе нешта высветліць, натыкаецца болей на пытанні, чым на адказы. Апісанне зроблена ў 60-х гадах, прычым з пункту гледжання партыйных органаў. У выніку апошніх даследаванняў у нас з'явілася крыху іншая інфармацыя. Дагэтуль мы ведалі, што ў батальёне было 250 міліцыянераў. Але гэта лічба нічым не пацверджаная. Ёсць падставы меркаваць, што батальён быў нашмат большы па складзе, бо толькі з адной роты Мінскай школы міліцыі ў яго ўваходзіла як мінімум болей за сто чалавек. Нядаўна ў нас паявіліся фотаздымкі некалькіх абаронцаў з гэтага батальёна. А вынікам сёлетніх пошукаў у раёне вёскі Гаі сталі паднятыя намі астанкі 23 чырвонаармейцаў. Адзін з іх дакладна быў афіцэр, а вось па другім ёсць пытанні. Магчыма, ён і міліцыянер. Адзіны з усіх, каго мы знайшлі. Пры ім былі дакументы, якія зараз перададзены на экспертызу. Знойдзены таксама чатыры медальёны.

У пошукавых работах на месцах баёў батальёна Уладзіміра прымалі ўдзел і курсанты інстытута МУС. У першы дзень працавалі дзесяць навучэнцаў другога курса — усе добраахвотнікі.

Уладзімір Васькаўцоў, які родам з Гомеля, у пошуках удзельнічае ўпершыню.

— У мяне ваявалі два дзяды і прадзед. Усе, на жаль, загінулі, але ў нашай сям'і пра іх памятаюць, — кажа ён. — Калі пачуў, што трэба дапамагчы ў пошуках загінулых на вайне, адразу ж згадзіўся. Цікава ведаць сваю гісторыю, бачыць, з чым нашы прадзеды ваявалі. А яшчэ — дапамагчы ваенным археолагам знайсці што-небудзь.

Намеснік начальніка Магілёўскага інстытута МУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Дзмітрый ПАНУЖДАЕЎ лічыць, што падобныя экспедыцыі выхоўваюць у курсантах пачуццё патрыятызму і любові да радзімы. І няма розніцы, каго ты знойдзеш у зямлі, — загінулага міліцыянера або звычайнага салдата. Яны рабілі адну справу — абаранялі свой край.

— Гэта сумесная работа з пошукавым клубам «Віккру» па высвятленні сапраўдных абставін абароны Магілёва вельмі важная, — кажа ён. — Знаходзяцца новыя байцы, якія па-хрысціянску будуць пахаваныя. І вельмі прыемна, што першы здымак, які мы набылі, даў штуршок для далейшых пошукаў.

Першыя знаходкі.

Мікалай БАРЫСЕНКА, старшыня магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»:

— Гэта была першая сёлета вахта памяці, або, як гэта афіцыйна называецца, — пошукавыя экспедыцыі на месцах баёў у ліпені 41-га батальёна міліцыі пад камандаваннем капітана Уладзіміра і 209-га процітанкавага дывізіёна 121-й стралковай дывізіі. Удзел у абароне Магілёва прымаў дывізіён тульскіх апалчэнцаў: ён стаяў на ўчастку ад Шклоўскай шашы да ракі Дняпро, а батальён НКУС маёра Калугіна знаходзіўся бліжэй да Мінскай шашы. На гэты раз мы працавалі за сто метраў ад Шклоўскай шашы на пазіцыях, якія займаў 209-ы процітанкавы дывізіён. Баі тут праходзілі з 12 да 21 ліпеня. Толькі 21 ліпеня вышыня Уладзіміра была ўзята, а не 18-га, як лічылася раней. У справаздачы 7-й Мюнхенскай пяхотнай дывізіі гаворыцца, што ў гэты дзень быў «узяты ўзорна ўмацаваны пункт савецкіх войскаў каля вёскі Гаі». Гэта дакументальнае сведчанне таго, што міліцыянеры і байцы Чырвонай арміі трымаліся тут на некалькі дзён больш.

Першае пахаванне, дзе побач з чырвонаармейцамі ляжалі міліцыянеры, мы знайшлі ў 1995 годзе ў раёне пераезда. Тады мы паднялі 29 чалавек. Міліцыянераў распазналі па свістках, высокіх ботах, партупеях, спецыфічных зорках. Усе гэтыя 29 байцоў пахаваныя на вышыні капітана Уладзіміра. Сёлетнія раскопкі паказалі, што работы тут трэба працягваць. І мы яшчэ абавязкова сюды вернемся. У апошняй траншэі, якую мы зачапілі, было знойдзена 13 байцоў. І гэтую траншэю трэба дапрацоўваць.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Слободской сельский исполнительный комитет

29 мая 2019 года по адресу: аг. Слобода, ул. Школьная, 5, зал заседаний (2-й этаж) в 15.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена *(бел. руб.)*	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) *(бел. руб.)*
Лот № 1	Слободской с/Совет	д. Верхнёман, ул. Центральная, уч. 14	0,2337	625681301601000001	2828	-
Лот № 2	Слободской с/Совет	д.Долгиново, ул. Центральная, уч. 4А	0,1500	625683203501000098	2250	966,23
Лот № 3	Слободской с/Совет	д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 63	0,1306	625681304101000092	1900	63,10
Лот № 4	Слободской с/Совет	д. Гущино, ул. Центральная, уч. 4а	0,2176	625681303601000025	2202	-
Лот № 5	Слободской с/Совет	д. Антоново, ул. Центральная, уч. 4а	0,2387	625681300101000029	2993	-
Лот № 6	Слободской с/Совет	д. Жачково, ул. Центральная, уч. 19	0,1740	625680403601000019	1340	48,60
Лот № 7	Слободской с/Совет	д. Кривели, ул. Центральная, уч. 2В	0,2500	625683205601000096	15000	1204,33
Лот № 8	Слободской с/Совет	д. Пырашево, ул. Садовая, уч. 1А	0,2345	625683207301000083	2500	73,50

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

Участки в п. Верхнёман, д. Гущино, д. Антоново, д. Жачково, находятся возле лесного массива.

Участки в д. Долгиново находятся вблизи леса.

Участок в д. Кривели находится вблизи озера и лесного массива.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет BY96AKBB36410625001560000000, БИК AKBBBY21500 Слободской сельский исполнительный комитет в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, УНП 601073740, код платежа — 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Слобода, ул. Школьная, 5, кабинет управляющего делами, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 24 мая 2019 года включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 32-215, 32-414.

Председатель Т. П. Пракатень

Беларучский сельский исполнительный комитет

извещает о проведении 11 июня 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
1	Минская область, Логойский район, д. Малые Гаяны У-2, кадастровый номер 623280404101000103,	0,1500	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	5 600,00	*1 877,17+ публикация объявления*	560,00
2	Минская область, Логойский район, д. Прудище, ул. Центральная, кадастровый номер 623280407101000054,	0,1152	Возможность подключения к электро-водоснабжению, подъезд с грунтовой дороги	6 100,00	*2047,43+ публикация объявления*	610,00
3	Минская область, Логойский район, д. Великие Гаяны, У-2 кадастровый номер 623280401601000054,	0,1479	Возможность подключения к электро-, водо-газоснабжению, подъезд с грунтовой дороги	3 500,00	*1628,06+ публикация объявления*	350,00

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY97AKBB36006190111210000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК банка AKBBBY2X, код платежа — 4901, УНН 600537220 (600181549) получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 11 июня 2019 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются в рабочие дни с 8.00-13.00 с 14.00-17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. **Последний день приема заявлений — 4 июня 2019 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28636, 28945, 8-029-1955545**

Песню бярыце з сабою...

АБЕЛІСКІ

Рубрыку вядзе
Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

Іван Карэнда (нар. у 1950-м) — сучасны беларускі паэт, празаік, журналіст, грамадска-палітычны дзеяч. Аўтар зборнікаў лірыкі «Белы наліў», «Знічка», «Васількі надзеі», паэтычнай кнігі для дзяцей «На загадкі ёсць адгадкі», кнігі прозы «Воплаўская госця». На вершы Івана Карэнды беларускімі кампазітарамі напісана больш за 30 песень.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі. У розныя гады працаваў на адказных пасадах, у тым ліку намеснікам міністра інфармацыі Беларусі, намеснікам міністра культуры і друку Беларусі, на розных пасадах у Выканкаме Саюза Беларусі і Расіі, начальнікам галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, саветнікам пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

**Вершы — Івана КАРЭНДЫ,
музыка — Яўгена КСЯНЕВІЧА.**

Куплет 1:
Пад Масквою, Кіевам і Мінскам,
Ля дарог, у стэпах і лясах —
Абеліскі, славы абеліскі...
І імёны ў кветках, ў верасах.

Прыпеў:
Ім у бронзе, у граніце шэрым
Моўчкі з намі крочыць праз вякі.
Мы іх праўдзе, іх сумленню верым,
Абеліскі — нашы маякі.

Куплет 2:
А над імі птушак спеў вясновы
І асенні ціхі лістапад...
Ў маім сэрцы, цяжкаю падковай,
Боль за ўсіх загінулых салдат.

Прыпеў.



Даты Падзеі Людзі

10 МАЯ

У краіне

1745 год — нарадзіўся (г. Гродна) Леан Сітанскі, скрыпач, дырыжор, педагог. Адзін з найбольш таленавітых музыкантаў свайго часу. З 1765 года першы скрыпач і капельмайстар Гродзенскай капэлы Тызенгаўза, кіраўнік Гродзенскай музычна-тэатральнай школы Тызенгаўза. У 1781 годзе выступаў з канцэртамі ў Італіі. Пад яго кіраўніцтвам Гродзенская капэла стала адной з найлепшых у Еўропе. Памёр у 1800 годзе.

1892 год — у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё першых дзвюх ліній коннай чыгункі, якая злучыла чыгуначныя вакзалы і ўскраінныя кварталы горада з цэнтрам. У першыя дні конка перавозіла прыкладна пятую частку даросłага насельніцтва Мінска. Першапачаткова дзейнічалі дзве лініі — Вакзальная, якая злучыла Брэсцкі і Віленскі вакзалы па вуліцах Маскоўскай і Бабруйскай, і Цэнтральная, праведзеная ад Віленскага вакзала да Саборнай плошчы. Праз тры гады была ўведзена Няміга-Захар'еўская лінія (ад сучаснага раёна парку імя Я. Купалы да вуліцы Рэспубліканскай). У 1929 годзе на змену мінскай концы прыйшоў першы трамвай.

1909 год — нарадзіўся Барыс Васілевіч Ерафееў, беларускі вучоны ў галіне фізіка-хіміі, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1939 года ў АН Беларусі: дырэктар Інстытута хіміі, затым — дырэктар Інстытута фізіка-арганічнай хіміі, у 1953—1956 гадах — віцэ-прэзідэнт АН Беларусі, адначасова ў 1951—1965 гадах загадчык кафедры БДУ. Аўтар больш чым 600 навуковых прац і 87 вынаходак. Работы па хімічнай кінетыцы, каталізе, топахімічных рэакцыях, аўтаакісленні арганічных злучэнняў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1995 годзе.

1934 год — нарадзіўся (вёска Дабрынь Ельскага раёна) Леанід Георгіевіч Бакштаеў, савецкі і ўкраінскі акцёр тэатра і кіно. Народны артыст Украінскай ССР. У кіно Леанід Бакштаеў пачаў здымацца з 1967 года. Рэжысёры даволі хутка вызначылі яго амплуа — на працягу двух дзесяцігоддзяў ён ствараў на экране гераічныя вобразы. Асабліва часта акцёра выкарыстоўвалі ў ваенных стужках: «На Кіеўскім напрамку», «Камісары», «Бумбараш», «Таямніца партызанскай зямлянкі», «Аты-баты, ішлі салдаты», «Чырвоныя дыпкур'еры», «Пунсовыя пагоны», «Вайна на заходнім напрамку» і іншых. Часам, праўда, рэжысёры «адпраўлялі» Бакштаева і ў процілеглы стан. Памёр у 1995 годзе.

У свеце

1919 год — нарадзіўся Даніэл Бэл, амерыканскі вучоны-сацыёлаг, заснавальнік тэорыі постындустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Памёр у 2011 годзе.

1926 год — нарвежска-амерыкана-італьянская экспедыцыя ў складзе 16 чалавек пад кіраўніцтвам Р. Амундсена, Л. Элсуорта, У. Нобіле на дырыжаблі «Нарвегія» пачала першы ў гісторыі трансарктычны пералёт. 12 мая экіпаж дасягнуў Паўночнага полюса.

1934 год — нарадзілася Юлія Друніна, савецкая паэтэса-франтавік, грамадскі дзеяч. Аўтар зборнікаў вершаў: «Трывога», «Не бывае кахання нешчаслівага...», «Акопная зорка», «Свет пад алівамі», «Бабіна лета», «Завея», аўтабіяграфічнай аповесці «З тых вяршынь». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі. Памерла ў 1991 годзе.

1940 год — нямецка-фашысцкія войскі ўварваліся ў Бельгію, Нідэрланды і Люксембург, а затым праз гэтыя акупаваныя тэрыторыі — у Францыю.

Тэлесеткі

«ЕЎРАБАЧАННЕ» — БУЙНЫМ ПЛАНАМ

Ужо ў гэту нядзелю ў Тэль-Авіве пройдзе ўрачыстая цырымонія адкрыцця 64-га міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне». А ў наступны аўторак, 14 мая, прадстаўніца нашай Беларусі, — самая юная сярод сёлетніх канкурсантаў, 16-гадовая спявачка ЗЕНА, — выступіць у першым паўфінале вялізнага шоу пад нумарам 8. Таксама ў гэты дзень за выхад у фінал будуць спаборнічаць артысты з Кіпра, Чарнагорыі, Фінляндыі, Польшчы, Славеніі, Чэхіі, Венгрыі, Сербіі, Бельгіі, Грузіі, Аўстраліі, Ісландыі, Эстоніі, Партугаліі, Грэцыі і Сан-Марына.

Беларуская ўдзельніца ўжо правяла дзве індывідуальныя рэпетыцыі на вялікай сцэне. І калі падчас першай рабіць фота альбо відэа было строга забаронена, то пасля ўнясення рэжысёрскіх карэктыў конкурсныя пастаноўкі і касцюмы ўдзельнікаў перасталі быць сакрэтам для прыхільнікаў конкурсу. Так, ЗЕНА рэпеціравала ў тынэйджарскім стылі — кароткі топ і легінсы, быццам бы размаляваныя яркімі графіці, а таксама ў высокіх белых батфортах, якія складаюцца з некалькіх частак і ўпрыгожаныя імем артысткі. Нумар Беларусі, які суправаджаецца энергічнымі танцамі, арганізатары ахарактарызавалі як «бадзёры і напружаны». Аднак ці дапаможа гэта энергетыка трапіць у дзясятку і працягнуць барацьбу за галоўны прыз «Еўрабачання-2019», даведаемся толькі ў наступны аўторак.

Прамую трансляцыю абодвух паўфіналаў і фіналу 14, 16 і 18 мая ўжо традыцыйна будуць весці тэлеканал «Беларусь 1» і міжнародны спадарожнікавы канал «Беларусь 24», а сёлета яшчэ і «РТР-Беларусь». Агляд канцэртаў, каляконкурсных падзей і самых цікавых удзельнікаў сёлетняга шоу шукайце таксама на сайце «Звязды».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.17	20.56	15.39
Віцебск —	5.01	20.52	15.51
Магілёў —	5.07	20.46	15.39
Гомель —	5.13	20.33	15.20
Гродна —	5.33	21.11	15.38
Брэст —	5.40	21.05	15.25

Месяц

Маладзік 5 мая.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Анастасіі, Івана, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Сямёна, Сяргея.*
К. *Антаніны, Антона, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Фінансавыя аналітыкі рэкамендуюць ужо сёння пачаць рабіць падушку бяспекі на восень, адкладваючы па 50 рублёў у кішэню асенняй курткі.

У ПВТ сакратароў-рэферэнтаў на сумоўі просяць паўтарыць прымаўку — «Стартапілі, стартапілі, ды не настартапілі».

Тры чароўныя словы, каб займець увагу любой дзяўчыны: «Мая мама — астролаг».

— Паглядзі, дарагая, які ў мяне сёння выдатны ўлоў.

— Суседка бачыла, як ты заходзіў у рыбны магазін.

— Ну, частку рыбы прыйшлося, вядома, прадаць.

Праваднік цягніка дома па звычцы зачыняе прыбіральню на ключ.

Шаноўную **Любоў Міхайлаўну Чыгрынаву** — адданую падпісчыцу і аўтарку «Звязды», разумніцу, дабрачынніцу, гумарыстку — шчыра віншуем з днём нараджэння, з юбілеем! *Зычым моцнага здароўя, натхнення, удач, «каб вам хацелася тварыць і са «Звяздою» гаварыць...» А іншым — слухаць.*

З павагай — звяздоўцы і сябры з усіх куткоў краіны.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1596.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 мая 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12